# Сусьветны ліст у падтрымку беларускай грамадзянская супольнасьці

*“Можаце сарваць усе кветкі, але вам не спыніць Вясну”*
*Пабла Нэруда*

162 праваабарончых арганізацыі заклікаюць спыніць рэпрэсіі супраць Праваабарончага цэнтру «Вясна» і іншых правабаронцаў у Беларусі. Мы асуджаем сістэматычныя адвольныя затрыманьні, зьбіцьці і катаваньні, якім яны падвяргаюцца. Нягледзячы на ўсебаковыя рэпрэсіі, беларускія правабаронцы працягваюць абараняць правы чалавека. Натхнёныя іх мужнасьцю, мы таксама не спынім нашую барацьбу за вызваленьне тых з іх, хто затрыманы, пакуль яны не будуць вызывалены і не змогуць свабодна і бесперашкодна працягваць сваю правабарончую дзейнасьць.

На працягу апошніх дзен мы сталі сведкамі чарговай хвалі вобшукаў і затрыманьняў беларускіх праваабаронцаў і актывістаў. Гэтыя рэпресіі, відавочна, з’яўляюцца помстай за іх дзейнасьць, накіраванай на выкрыцьцё і дакументацыю парушэньняў правоў чалавека, якія пачаліся пасьля жорсткіх рэпрэсій супраць мірных дэманстрантаў у жніўні 2020 года. З таго часу больш за 35000 беларусаў былі затрыманыя за ўдзел у мірных пратэстах і больш за 3000 палітычна матываваных спраў было ініцыявана ўладамі. За гэты перыяд праваабаронцы задакументавалі як мінімум 2500 выпадкаў катаваньняў. Па стане на 19 ліпеня 2021 у Беларусі налічваецца 561 палітычны зьняволены. Мы лічым, што гэтыя сістэматычныя і масавыя парушэньні правоў чалавека могуць складаць злачынствы супраць чалавечнасьці.

Паміж 14 і 16 ліпеня 2021 было праведзена больш за 60 ператрусаў у офісах беларускіх праваабарончых арганізацый і ў дамах іх супрацоўнікаў, у тым ліку ў праваабарончым цэнтры “Вясна” і дзвюх арганізацыях-членаў Міжнароднага Камітэта па расследваньню катаваньняў у Беларусі – “Хьюман Канстанта” і “Прававая Ініцыятыва” , а таксама ў Беларускім Хельсінскім камітэце, Беларускай Асацыяцыі Журналістаў, Цэнтры Прававой Трансфармацыі, Экадоме і ў шмат якіх іншых. Падчас ператрусаў былі канфіскаваны дакуманты, абсталяваньне, у тым ліку ноутбукі, тэлефоны і кампутары.

Падчас апошніх вобшукаў, было дапытана больш за 30 чалавек. 13 з іх былі затрыманыя на 72 гадзіны, як паведамляецца, у сувязі з расследваньнем парушэньня грамадскага парадку і ўхіленьнем ад выплаты падаткаў. Пазьней, большасьць з іх былі вызвалены, у тым ліку, **Мікалай Шарах, Сяргей Мацкевіч,** і чальцы “Вясны” **Андрэй Палуда, Алена Лапценак, Яўгенія Бабаева, Сяргей Сыс, Віктар Сазонаў, Алесь Капуцкі** і **Андрэй Мядзведзеў**. Некаторыя з іх, аднак, з’яўляюцца падазраванымі па крымінальнай справе і застаюцца пад падпіскай аб невыяздзе. **Алесь Бяляцкі**, старшыня “Вясны”, **Валянцін Стэфановіч**, намеснік старшыні “Вясны” і віцэ-прэзідент FIDH, а таксама **Уладзімір Лабковіч**, юрыст і член “Вясны” застаюцца затрыманымі. 17 ліпеня 2021 усе чацьвера былі пераведзены ў СІЗА № 1 г. Мінска на вул. Валадарскага. Чацьвера іншых чальцоў “Вясны” **Леанід Судаленка, Тацьцяна Ласіца, Марфа Рабкова** і **Андрэй Чапюк**, а таксама **Алег Граблеўскі**, з Офіса па правах людзей з інваліднасьцю, застаюцца пад арыштам з канца 2020 – пачатку 2021.

“Вясна”, адна з асноўных беларускіх правабарончых арганізацый, чалец сетак OMCT і FIDH, пераследуюцца беларускімі ўладамі на працягу больш, чым двух дзесяцігоддзяў. У жніўні 2011, старшыня “Вясны” Алесь Бяляцкі быў засуджаны на чатыры с паловай гады пазбаўленьня волі па надуманным абвінавачваньням і вызвалены ў чэрвені 2014 пасьля 1052 дзен адвольнага затрыманьня ў жудасных умовах. Зараз, таксама у адказ на мужную працу “Вясны” і нязменную пазіцыю ў галіне правоў чалавека беларускія ўлады спрабуюць знішчыць арганізацыю, пасадзіўшы за краты сем яе чальцоў.

Вобшукі пачаліся на наступны дзень пасьля таго, як Рада ААН па правах чалавека прыняла рэзалюцыю па правах чалавека ў Беларусі, у якой асудзіла сітуацыю, патрабавала вызваленьня ўсіх адвольна затрыманых і рассьледваньня ўсіх скарг аб катаваньнях і іншых парушэньнях правоў чалавека.

8-9 ліпеня і 16 ліпеня 2021 беларускія ўлады таксама правялі масавыя ператрусы ў офісах незалежных ЗМІ і дамах іх супрацоўнікаў, у тым ліку ў “Нашай Ніве”, адным з старэйшых незалежных выданьняў. Трое журналістаў былі затрыманыя. Офісы *Радые Свабоды* і *Белсата*, найбуйнейшага незалежнага телеканала, які асьвятляе падзеі ў Беларусі, некалькі журналістаў былі затрыманыя. На цяперашні час, больш за 30 працаўнікоў ЗМІ і дзесяткі блогераў застаюцца за кратамі.

**Мы, ніжэйпадпісаўшыяся грамадскія арганізацыі, засуджаем масавыя парушэньні правоў чалавека, якія здзяйсняюцца беларускімі ўладамі, якія, мы баімся, могуць выклікаць толькі больш гвалту. Гэтая апошняя хваля рэпрэсій, разам з жорсткім перасьледам на працягу апошніх месяцаў, сьведчаць пра тое, што ўлады намагаюцца пасадзіць усіх праваабаронцаў ці прымусіць іх выехаць з краіны.**

**Мы выказваем саліданасьць з нашымі калегамі і сябрамі, якія знаходзяцца за кратамі, якія падвяргаюцца рэпрэсіям і перасьледу за іх мужную працу. Мы сочым за вашай барацьбой з вялікім хваляваньнем і шкадаваньнем, і мы натхненыя вашай рашучасьцю і стойкасьцю**

**Мы патрабуем ад беларускіх уладаў спыніць пераслед і запалохваньне крытыкаў рэжыму, і вызваліць усіх несправядліва затрыманых праваабаронцаў, журналістаў і актывістаў.**

**Мы заклікаем міжнародную супольносьць заняць рашучую пазіцыю ў падтрымку беларускай праваабарончай супольнасьці і выказацца за вызваленьне ўсіх, хто знаходзіцца за кратамі і чые адзінае злачынства – патрабаваньне, каб грамадства было заснавана на справядлівасьці, а не страху.**

*Арганізацыі-падпісанты:*

1. Abdorrahman Boroumand Center for Human Rights in Iran - Іран
2. ACAT Belgique - Бельгія
3. ACAT Burundi - Бурундзі
4. ACAT España-Catalunya (Acción de los Cristianos para la Abolición de la Tortura) - Гішпанія
5. ACAT Germany (Action by Christians for the Abolition of Torture) - Нямеччына
6. ACAT Italia - Італія
7. ACAT République Centrafricaine – Цэнтральна-Афрыканская Рэспубліка
8. ACAT République Démocratique du Congo – Дэмакратычная Рэспубліка Конга
9. ACAT Suisse - Швейцарыя
10. ACAT Tchad - Чад
11. ACAT Togo - Тога
12. Action Against Violence and Exploitation (ACTVE) - Філіпіны
13. Action des Chrétiens Activistes des Droits de l’Homme à Shabunda (ACADHOSHA) - Дэмакратычная Рэспубліка Конга
14. Advocacy Forum – Nepal - Непал
15. Agir ensemble pour les droits humains - Францыя
16. Albanian Human Rights Group - Албанія
17. ALTSEAN-Burma - Мьянма
18. Anti Death Penalty Asia Network (ADPAN) – Малайзія/Азія-Ціхаакеанскі рэгіен
19. Anti-Discrimination Centre Memorial - Бельгія
20. ARTICLE 19

21. ASEAN Parliamentarians for Human Rights - Інданэзія
22. Asia Pacific Solidarity Coalition (APSOC) - Філіпіны
23. Asociación para una Ciudadanía Participativa (ACI PARTICIPA) - Гандурас
24. Asociación pro derechos humanos (Aprodeh) - Перу
25. Association Mauritanienne des droits de l'homme (AMDH-Mauritanieuri) - Маўрытанія
26. Association of Parents of Disappeared Persons (APDP) - Індыя
27. Association Tchadienne pour la promotion et la Défense des Droits de l'Homme (ATPDH) - Чад
28. Association tunisienne des femmes démocrates - Туніс
29. Avocats Sans Frontières France (ASF France) - Францыя
30. Banglar Manabadhikar Suraksha Mancha (MASUM) - Індыя
31. Belarusian-Swiss Association RAZAM.CH - Швейцарыя
32. Bulgarian Helsinki Committee - Балгарыя
33. Cambodian Center for Human Rights (CCHR) – Камбоджа
34. Capital Punishment Justice Project (CPJP) - Аўстралія
35. Center for Civil Liberties - Украіна
36. Center for Constitutional Rights (CCR) – Злучаныя Штаты Амерыкі
37. Centre for Applied Human Rights (CAHR), University of York – Злучанае Каралеўства
38. Centre for the Development of Democracy and Human Rights (CDDHR) - Расія
39. Centro de Derechos humanos Fray Bartolomé de las Casas A.c. (Frayba) - Мексіка
40. Centro de Derechos Humanos Paso del Norte - Мексіка
41. Centro de Investigación y Promoción de los Derechos Humanos (CIPRODEH) - Гандурас
42. Centro de Prevención, Tratamiento y Rehabilitación de Victimas de la Tortura y sus familiares (CPTRT) - Гандурас
43. Centro de Salud Mental y Derechos Humanos (CINTRAS) - Чілі
44. Changement Social Bénin (CSB) - Бенін
45. CIVICUS
46. Civil Rights Defenders (CRD) - Швецыя
47. Comision Nacional de los Derechos Humanos (CNDH-RD) – Дамініканская Рэспубліка
48. Coalition Burkinabé des Défenseurs des Droits Humains (CBDDH) – Буркіна Фасо
49. Coalition Marocaine contre la Peine de Mort - Марока
50. Coalition Tunisienne Contre la Peine de Mort - Туніс
51. Collectif des Associations Contre l'Impunité au Togo (CACIT) - Тога
52. Comisión de derechos humanos – COMISEDH - Перу
53. Comité de Familiares de Detenidos Desaparecidos en Honduras (COFADEH) - Гандурас
54. Comité de solidaridad con los presos políticos (FCSPP) - Калумбія
55. Committee on the Administration of Justice (CAJ) – Паўночная Ірландыя (ЗК)
56. Crude Accountability - Злучаныя Штаты Амерыкі
57. Czech League of Human Rights - Чэхія
58. Death Penalty Focus (DPF) - Злучаныя Штаты Амерыкі
59. Defenders of human rights centre - Іран
60. DEMAS - Association for Democracy Assistance and Human Rights - Чэхія
61. DITSHWANELO - The Botswana Centre for Human Rights - Баствана
62. Eastern Partnership Civil Society Forum (EaP CSF) - Бельгія
63. Eleos Justice, Monash University - Аўстралія
64. Enfants Solidaires d'Afrique et du Monde (ESAM) - Бенін
65. Federal Association of Vietnam-Refugees in the Federal Republic of Germany - Нямеччына
66. FIDU - Italian Federation for Human Rights - Італія
67. Finnish League for Human Rights - Фінляндыя
68. Free Press Unlimited - Нідэрланды
69. Fundación Regional de Asesoría en Derechos Humanos (INREDH) - Эквадор
70. GABRIELA Alliance of Filipino Women - Філіпіны
71. German Coalition to Abolish the Death Penalty (GCADP) - Нямеччына
72. Greek Helsinki Monitor - Грэцыя
73. Helsinki Citizens' Assembly – Vanadzor - Арменія

74. Helsinki Foundation for Human Rights - Польшча
75. Citizens' Watch - Расія
76. Human Rights Alert - Індыя
77. Human Rights Association (İHD) - Турцыя
78. Human Rights Center (HRC) - Грузія
79. Human Rights Center (HRC) "Memorial" - Расія
80. Human Rights House Foundation
81. Human Rights in China (HRIC) - ЗША
82. Human Rights Monitoring Institute (HRMI) - Літва
83. Human Rights Mouvement “Bir Duino-Kyrgyzstan” - Кыргызстан
84. Human Rights Organization of Nepal - Непал
85. Humanist Union of Greece (HUG) - Грэцыя
86. Hungarian Helsinki Committee - Вугоршчына
87. ICJ-Кенія
88. IDP Women Association "Consent" - Грузія
89. Independent Medico-Legal Unit (IMLU) - Кенія
90. Instituto de Estudios Legales y Sociales del Uruguay (IELSUR) - Уругвай
91. International Commission of Jurists (ICJ) - Kenyan Section - Кенія
92. International Federation for Human Rights (FIDH) - Францыя
93. International Legal Initiative - Казахстан
94. International Partnership for Human Rights (IPHR) - Бельгія
95. International Service for Human Rights (ISHR) - Швейцарыя
96. Jammu Kashmir Coalition of Civil Society - Індыя
97. JANANEETHI - Індыя
98. Justice for Iran (JFI) – Злучанае Каралеўства
99. Justícia i Pau - Гішпанія
100. Kazakhstan International Bureau for Human Rights and the Rule of Law - Казахстан
101. Kharkiv Regional Foundation "Public Alternative" - Украіна
102. La Strada International - Нідэрланды
103. La Voix des Sans Voix pour les Droits de l'Homme (VSV) – Дэмакратычная Рэспубліка Конга
104. Latvian Human Rights Committee (LHRC) - Латвія
105. Lawyer's Committee for Human Rights YUCOM - Сербія
106. League for the Defence of Human Rights in Iran (LDDHI) - Іран
107. Legal Policy Research Centre (LPRC) - Казахстан
108. Libereco Partnership of Human Rights - Нямеччына/ Швейцарыя
109. LICADHO - Камбоджа
110. Lifespark - Швейцарыя
111. Liga Portuguesa dos Direitos Humanos - Civitas (LPDHC) - Партугалія
112. Liga voor de Rechten van de Mens (LvRM) (Dutch League for Human Rights) - Нідэрланды
113. Ligue des droits de l'Homme (LDH) - Францыя
114. Ligue Tchadienne des droits de l'Homme - Чад
115. Maldivian Democracy Network (MDN) - Мальдзівы
116. Martin Ennals Foundation - Швейцарыя
117. Minority Rights Group - Грэцыя
118. Mouvance des Abolitionnistes du Congo Brazzaville – Канга Бразавіль
119. Mouvement Ivoirien des Droits Humains (MIDH) – Кот д’Івуар
120. Mouvement Lao pour les Droits de l'Homme - Лаос
121. Movimento Nacional de Direitos Humanos (MNDH) - Бразілія
122. Netherlands Helsinki Committee - Нідэрланды
123. Norwegian Helsinki Committee - Нарвегія
124. Observatoire du système pénal et des droits humains (OSPDH) - Гішпанія
125. Observatoire Marocain des prisons - Марока
126. Odhikar - Бангладэш

127. OPEN ASIA|Armanshahr - Францыя
128. Organisation contre la torture en Tunisie (OCTT) - Туніс
129. Organisation Guineenne de Defense des Droits de l'Homme et du Citoyen (OGDH) - Гвінея
130. Österreichische Liga für Menschenrechte ÖLFMR - Аўстрыя
131. Palestinian Center for Human Rights (PCHR) - Палестына
132. Pax Christi Uvira – Дэмакратычная Рэспубліка Конга
133. People's Watch - Індыя
134. Programa Venezolano de Educación-Acción en Derechos Humanos (Provea) - Венесуэла
135. Promo LEX Association – Рэспубліка Малдова
136. Protection International (PI)
137. Public Association "Dignity" - Казахстан
138. Public Association Spravedlivost Human Rights Organization – Кыргызстан
139. Public Verdict Foundation - Расія
140. Rencontre Africaine pour la Défense des Droits de l'Homme RADDHO - Сенегал
141. Repecap Academics - Гішпанія
142. Réseau des Defenseurs des Droits Humains en Afrique Centrale (REDHAC) - Камерун
143. Réseau National de Défense des Droits Humains (RNDDH) - Гаіці
144. Rights Realization Centre – Злучанае Каралеўства
145. Rural People`s Sangam - Індыя
146. Salam for Democracy and Human Rights – Злучанае Каралеўства, Ліван, Бахрэйн
147. Social-Strategic Researches and Analytical Investigations Public Union (SSRAIPU) - Азербайджан
148. SOHRAM-CASRA - Centre Action Sociale Réhabilitation et Réadaptation pour les Victimes de la Torture, de la guerre et de la violence - Турцыя
149. SOS-Torture/Burundi - Бурундзі
150. SUARAM - Малайзія
151. Syndicat national des agents de la formation et de l'education du Niger (SYNAFEN NIGER) - Нігер
152. Task Force Detainees of the Philippines (TFDP) - Філіпіны
153. Thai Action Committee for Democaracy in Burma (TACDB) – Тайланд
154. The Advocates for Human Rights - Злучаныя Штаты Амерыкі
155. The Barys Zvozskau Belarusian Human Rights House (BHRH) - Літва
156. The Commission for the Disappeared and Victims of Violence (KontraS) - Інданэзія
157. The International Rehabilitation Council for Torture Victims (IRCT)
158. Urgent Action Fund for Women's Human Rights - Злучаныя Штаты Амерыкі
159. Vietnam Committee on Human Rights (VCHR) - Францыя
160. World Coalition Against the Death Penalty (WCADP) - Францыя
161. World Organization Against Torture (OMCT) - Швейцарыя
162. Xumek asociación para la promoción y protección de los derechos humanos - Аргентына